Добраахвотнае страхаванне дадатковай накапляльнай пенсіі

З 1 кастрычніка 2022 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 верасня 2021 г. № 367 уведзены дадатковы від пенсіённага страхавання – добраахвотнае дадатковае накапляльнае пенсіённае страхаванне з фінансавай падтрымкай дзяржавы (праграма «3+3»).

Гэтая праграма дае магчымасць кожнаму грамадзяніну, які працуе, да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (жанчыны – 58 гадоў, мужчыны – 63 гады) сфарміраваць дадатковую крыніцу пенсіённых выплат (другую пенсію) пры асабістым фінансавым удзеле з прыцягненнем у індывідуальныя пенсіённыя накапленні сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Падрабязную інфармацыю аб парадку страхавання можна прачытаць на сайце Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/dobraakhvotnae-strakhavanne-dadatkovay-nakaplyalnay-pensii*